выкарыстання адпаведнай паэтыкі. Таму цалкам натуральным і заканамерным з'яўляецца зварот пісьменніка да сродкаў мастацкай экспрэсіі, уласцівых рамантызму.

Пры стварэнні мастацкіх вобразаў пісьменнік часцей за ўсё карыстаецца выдумкай, адвольным, часта інтуітыўным выбарам прыёмаў і сродкаў псіхалагічных характарыстык, спосабаў самавыяўлення герояў. На думку А. Мальдзіса, у тых выпадках, калі У. Караткевіч звяртаецца да гістарычна канкрэтных фактаў і асоб, ён «дапускае толькі такую разнавіднасць катэгорыі магчымага, як домысел. Дзякуючы яму на аснове няпоўнага, частковага ці нават гіпатэтычнага ведання здабываецца яго поўны ці неабходны для перакананаўчага ўспрымання аб'ём. Без дасягнення гарманічнай раўнавагі ўзнікае парушэнне жанравых законаў гістарычнага рамана, зараждаецца сумненне ў верагоднасці яго рэальна-фактычнай асновы» [4, с. 45].

**Заключэнне.** Зварот У. Караткевіча да гістарычнага матэрыялу значна ўзбагаціў беларускую літаратуру ў ідэйна-тэматычных і жанравых адносінах. Уладзімір Караткевіч — адна з найбольш яркіх фігур у беларускай літаратуры другой паловы ХХ стагоддзя. Яго таленавітасць, глыбокая эрудзіраванасць, патрыятызм з'явіліся той асновай, на якой грунтуюцца творчыя здабыткі пісьменніка. Творы выдатнага мастака слова не толькі паглыбляюць нашы веды па гісторыі, але і вучаць любіць і берагчы чалавечнае ў чалавеку, змагацца з бездухоўнасцю, знаходзіць ідэальнае і гарманічнае ў жыцці і прыродзе.

**Спіс цытаваных крыніц**

1. *Шынкарэнка, В. К.* Пад ветразем дабра і прыгажосці: жанрава-стылявыя асаблівасці прозы У. Караткевіча / В. К. Шынкарэнка. — Мінск : Навука і тэхніка, 1995. — 175 с.
2. *Верабей, А.* Абуджаная памяць : нарыс жыцця і творчасці У. Караткевіча / А. Верабей. — Мінск : Маст. літ., 1997. — 256 с.
3. *Каваленка, В.* Аблічча мінулага: праўда і вымысел : аб творчасці У. Караткевіча / В. Каваленка. — Мінск : Маст. літ., 1987. — 230 с.
4. *Мальдзіс, А.* Жыццё і ўзнясенне Уладзіміра Караткевіча: партрэт пісьменніка і чалавека / А. Мальдзіс. — Мінск : Маст. літ., 1990. — 230 с.

УДК 821.161.3:82-1Каратынскі

**Д. С. Доўнар**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы*

## ЛЕКСІЧНЫЯ СРОДКІ Ў ПЕЙЗАЖНАЙ ЛІРЫЦЫ ВІНЦЭСЯ КАРАТЫНСКАГА

**Уводзіны.** Лексічныя сродкі выразнасці выступаюць асноўным спосабам раскрыцця вобразаў у паэтычных творах. Яны дапамагаюць лаканічна, трапна, дакладна раскрыць аўтарскую ідэю. Асабліва важным сродкам яны з'яўляюцца ў тэкстах пейзажнай лірыкі.

**Асноўная частка**. Пейзаж — малюнкі прыроды, апісанне ў літаратурным творы розных мясцовасцей (горад, вёска, чыгунка) [4, с. 495]. Троп — слова ці моўны выраз, ужытыя ў пераносным значэнні [4, с. 72].

Сустракаюцца тропы ў маўленні, літаратурнай мове ўвогуле, але найчасцей — у мове мастацкай літаратуры, асабліва ў паэзіі, дзе назіраецца своеасаблівая іх канцэнтрацыя. Дапамагаюць у вобразнай і лаканічнай форме выявіць сутнасць з'явы, індывідуалізаваць яе, даць ёй ацэнку.

Тропы — не «акраса», а адзін са спосабаў вобразнага пазнання жыцця, яны ўзбагачаюць літаратурную мову новымі сэнсавымі адценнямі. Таму не дзіўна, што паэты адчуваюць арганічную патрэбу ў тропах [4].

Адрозніваюць два тыпы тропаў: 1) простыя — эпітэт, параўнанне; 2) складаныя — метафара, адухаўленне, увасабленне, сінестазія, аксімаран, метанімія, сінекдаха, гіпербала, літота, іронія, алегорыя, сімвал, гратэск, перыфраза, антанамазія, эўфемізм, апастрофа, ідыёма, зваротная метафарызацыя, паэтычны этымалагізм.

Пры відавочным, часам нават значным адрозненні розных відаў тропаў для ўсіх іх характэрна адна агульная рыса — арыентаванасць у словах не на першаснае, прамое значэнне, а на пераноснае.

У беларускай паэзіі склаліся даўнія і значныя традыцыі ў адлюстраванні прыроды, яна выпрацавала сваю сістэму важнейшых прынцыпаў выяўленчасці і поглядаў на мастацтва пейзажу.

Пейзажная творчасць з'яўляецца высокай, сапраўды эфектыўнай формай мастацкага самараскрыцця асобы і выяўлення адносінаў да навакольнай рэчаіснасці. У дачыненні да паэтычнага пейзажу можна

© Доўнар Д. С., 2020



Репозиторий БарГУ

сказаць, што ён уяўляе сабой цэлы мастацкі свет, з якім арганічна звязана кола аўтарскіх думак, уяўленняў і назіранняў.

Важнейшай рысай пейзажу з'яўляецца тып адлюстраванай прасторы, мясцовасці, яе найбольш характэрныя, абагульненыя прыродна-геаграфічныя прыкметы. Нацыянальны пейзаж — тыпавое адлюстраванне беларускай прыроды; экзатычны — карціны і замалёўкі прыроды іншых краін. Неабходна таксама вылучыць ландшафтныя пейзажы (лясны, лугавы, рачны, азёрны, палявы, балотны і т. п.), вясковы і гарадскі (урбаністычны), індустрыяльны, архітэктурны і інш.

Увагу на з'явы прыроды звяртаў Вінцэсь Каратынскі. Вінцэнт (Вінцэсь) Аляксандравіч Каратынскі (15 чэрвеня 1831 года, в. Селішча каля Любчы, цяпер Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць — 7 лютага 1891 года). Адукацыю В. Каратынскі набыў самавукам, пад наглядам мясцовага арганіста. Навучыў чытаць і пісаць малодшых братоў. Працаваў хатнім настаўнікам. У 1850—1862 гадах быў сакратаром У. Сыракомлі. За кароткі час самавукам атрымаў выдатную адукацыю, апроч беларускай і польскай, валодаў рускай, чэшскай, французскай і нямецкай мовамі, крыху ведаў з лаціны. Граў на скрыпцы. Разам з рускім пісьменнікам М. Лясковым падарожнічаў па Паўночна-Заходнім краі. Супрацоўнічаў з польскімі газетамі і часопісамі, друкаваў артыкулы, тэматычна звязаныя з беларускім краем.

Вінцэсь Каратынскі з'яўляецца прыкметнай постаццю ў гісторыі беларускай літаратуры 50-х гадоў XIX стагоддзя. Выхадзец з нізоў грамадства, дзякуючы нястомнай працы над сабой, ён становіцца адным з вядомых у краі літаратараў і журналістаў. Прыналежнасць да разначыннай інтэлігенцыі, якая не парывала духоўнай сувязі са сваёй асновай, сялянствам, пэўным чынам вызначыла тэматыку, ідэйную скіраванасць, стылёвую спецыфіку паэзіі Вінцэся Каратынскага. Яго творы выяўляюць глыбінную сувязь з народным светаадчуваннем, скіраваны на абарону самай бяспраўнай і зняважанай істоты — прыгоннага мужыка, нацэлены на філасофскі пошук сусветнай гармоніі, калі «Бог загасцюе ў лучнасці свету» [2, с. 107].

З паэтычнай спадчыны Каратынскага выразна відаць, што яго грамадска-палітычныя ідэалы, як і многіх іншых пісьменнікаў той пары, сфарміравалі ідэйныя асновы Асветніцтва [2, с. 107—108]. Для пісьменніка характэрна маральнае адмаўленне рэчаіснасці з усёй яе сацыяльнай і духоўнай паталогіяй. Крыніцай зла, у разуменні Каратынскага, выступае сацыяльная няроўнасць, а таксама ўнутраныя, духоўныя, заганы чалавека: хціваcць, чэрствасць, эгаізм і бессардэчнасць. Вырашэнне праблемы пралягае найперш у выпраўленні чалавечага нораву, духоўным узвышэнні і ўдасканаленні чалавека, аднаўленні яго светлай боскай сутнасці [1, с. 10].

Сваімі творамі Каратынскі імкнецца звярнуць увагу адукаванага грамадства на амаральнасць сацыяльнай няроўнасці. У вершы «Галодная пара» [3, с. 41—43] аўтар паказвае трагічны канец няшчаснага згаладалага селяніна, які марна шукае спагады і ратунку ў абыякавых людзей [2, с. 108]. У гэтым вершы Вінцэсь Каратынскі выкарыстоўвае такія тропы, як метафара: ***дожджык узрушыць*** (з дапамогай гэтага тропа аўтар паказвае, што дождж з'яўляецца своеасаблівай постаццю для сялянскага народу. Калі дожджык не ўзрушыць, то на замельцы мала чаго вырасце), ***расткі выклікае, завязваеш сонца*** (селянін звяртаецца да вясны, хоча, каб сонца свяціла ярчэй і грэла ўсё наогул, але ўсё ідзе супраць яго), ***бываеш злой, зямлю сагрэла*** (тут аўтар паказвае нам, што праз нейкі час прырода ўсё ж такі пачынае абуджацца), ***вярнула сілы, гром узрушыць, дожджык напоіць, заспакоіць зеллем***; эпітэты: ***яснае неба, свіран багаты, зелле галоднае***; гіпербала: ***прыкажаш сонцу***; параўнанні: ***што дробнай расой, траўка расце, ці крапіўка якая.*** У гэтым вершы аўтар паказвае дыялог галоўнага героя з прыродай.

Таксама аўтар апісвае вясновы пейзаж. У вершы «Першы дзень вясны» [3, с. 16—18] Каратынскі паказвае супрацьстаянне аптымістычнага, радаснага вітання вясны і настрою сялянскіх людзей. Менавіта пейзаж служыць для раскрыцця сялянскага жыцця. Антытэза сацыяльнага жыцця і жыцця прыроды раскрываецца праз такія моўныя сродкі, як метафара: ***рупіць сонцу ды ў старонцы веснаваці, тлее снег*** (гэтай метафарай аўтар падкрэслівае, што вясна прыходзіць няспешна, марудна. Снег тлее настолькі няспешна, як тлеюць апошнія вугалькі ў вогнішчы), ***поўніць песняй душы*** (надыход вясны можна параўнаць з зачынам песні. Гэта своеасаблівы ўступ да «новага жыцця» прыроды), ***сонца рушыць, усцешыў сэрца, пачуццё гарэла, абгоны з ветрам***; эпітэты: ***шчыра веснаваці, з думаю вясновай, новай марай, неспазнаны свет абняў, жаўрукова мова, час зімовы стаў суровы*** (гэтым мастацкім сродкам Каратынскі паказвае, што беларускі народ вельмі чакае вясну, бо ў гэты перыяд часу пачынаецца пасеў), ***зямліца-камяніца, цяпло-спагада***; параўнанне: ***вясна як жывая.***

Па традыцыях беларускага фальклору Каратынскі пабудаваў верш «Два каханні» [3, с. 24—25]. У вуснай народнай творчасці беларусаў часта выкарстоўваецца вобраз каліны, як вобраз маладой дзяўчыны, а вобраз салаўя — як вобраз маладога хлопца. Асаблівую цікавасць уяўляе здольнасць паэта паказаць два, здавалася б, зусім немагчымыя для параўнання каханні, паказаць агульнасць пачуццяў чалавечых і звышчалавечых — пачуццяў прыроды. Для таго каб перадаць непарыўную сувязь чалавека і прыроды, В. Каратынскі выкарыстоўвае ў гэтым вершы такія мастацкія сродкі, як метафара: ***каліна глядзіцца, рада слухаць каліна, згляне салавей***; эпітэт: ***згляне жыва.***

**Заключэнне.** Для лаканічнага, трапнага раскрыцця пейзажу і для адлюстравання стану прыроды аўтар выкарыстоўвае параўнанні, эпітэты, метафары. Яны сведчаць пра працяг Вінцэсем Каратынскім вуснай паэтычнай традыцыі ў адлюстраванні пейзажа.



Рэпазіторый БарДУ

**Спіс цытаваных крыніц**

1. *Бурдзялёва, І.* Тэматыка і стылёвая палітра твораў Вінцэся Каратынскага / І. Бурдзялёва // Род. слова. — 2007. — № 6. — С. 9—10.
2. *Бурдзялёва, І.* Стылёвая палітра Вінцэся Каратынскага / І. Бурдзялёва // Вінцэсь Каратынскі ў беларуска-славянскім літаратурным узаемадзеянні : матэрыялы Рэсп. навук. канф., Мінск, 29 верас. 2006 г. — Мінск : Бел. навука, 2006. — С. 107—113.
3. *Каратынскі, В.* Творы : для ст. шк. узросту / В. Каратынскі ; уклад., прадм. і камент. У. Мархеля. — Мінск : Маст. літ., 2009. — 334 с.
4. *Рагойша, В. П.* Паэтычны слоўнік / В. П. Рагойша. — 3-е выд., дапрац. і дап. — Мінск : Бел. навука, 2004. — 576 с.

УДК 821.161.3:8231Марчук

**Я. У. Кавальчук**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы*

# МАТЫЎ СІРОЦТВА Ў РАМАНЕ ГЕОРГІЯ МАРЧУКА «КВЕТКІ ПРАВІНЦЫІ»

**Уводзіны.** Свет уступіў у XXI стагоддзе, аднак праблема дзяцей-сірот па-ранейшаму актуальная. Сіроцтва як сацыяльная з’ява ўзнікла ў глыбокай старажытнасці. Адлюстраванне гэтай тэмы шырока выяўлена ў вуснай народнай творчасці. Лёсы сірот паказаны ў творах розных жанраў: апавяданнях (Якуб Колас «Сірата Юрка», «Дзеравеншчына», Цётка «Сірата», Уладзіслаў Галубок «Сірата Ганузя»), аповесцях (Янка Брыль «Сірочы хлеб», Уладзімір Ягоўдзік «Вочы начніцы»), раманах (Георгій Марчук «Кветкі правінцыі»).

Сучасны беларускі пісьменнік Георгій Марчук мае ў сваёй творчай скарбонцы жанрава і тэматычна разнастайныя творы. Самабытнасць і вышыня таленту пісьменніка, глыбіня і непаўторнасць яго душы ўвасобіліся праз каларытнае беларускае слова ў п’есах, аповесцях, апавяданнях, раманах, навелах, афарызмах, канонах, казках, сцэнарыях [1].

Вывучэннем жыцця і творчасці Г. Марчука займаюцца Л. Іконнікава («Творчасць Георгія Марчука: жанравыя асаблівасці, канцэптасфера, мастацкія дамінанты»), З. Прыгодзіч («“Працуй сумленна штодня і поспех знойдзе цябе”: Георгій Марчук»), А. Марціновіч («Сусвет пачынаецца на Палессі столінскім. Георгій Марчук»), В. Заяц («Афарыстычныя выслоўі ў “Давыд-гарадоцкіх канонах” Георгія Марчука»). Даследаванні праведзены А. Белай, У. Навумовічам, Т. Пучынскай, Н. Радзівончык, І. Саверчанкам і інш. Такім чынам, можна гаварыць пра неабходнасць даследавання асобнага аспекту ў творчасці Г. Марчука — матыву сіроцтва на матэрыяле рамана «Кветкі правінцыі».

**Асноўная частка.** У рамане «Кветкі правінцыі» галоўны герой Адась Доля — местачковы хлапчук, які, рана застаўшыся без маці, пакутліва шукае дарогу ў самастойнае жыццё. Персанаж праходзіць складаны шлях маральнага развіцця. Перад чытачом паступова разгортваецца карціна духоўнай эвалюцыі Адася, пачынаючы ад апісання жыцця разгубленага хлопчыка да выяўлення вобраза самадастатковай асобы ў канцы рамана [2].

У імені героя зроблены акцэнт на яго лёсе, жыцці сіраты. Асаблівай сэнсавай згушчанасцю, ушчыльненай канататыўнасцю адзначана прозвішча галоўнага героя рамана — Адася Долі. На сімволіку прозвішча і імя звярталі ўвагу даследчыкі літаратуры. Так, Е. Лявонава адзначае, што імя персанажа выклікае непазбежныя асацыяцыі з біблейскім персанажам. «Адась па-нашаму, па-руску Адам», — патлумачыць маці пры сустрэчы з Крутаяравым [3, с. 20]. Біблейны Адам, створаны Богам паводле свайго вобраза і падабенства, — першы чалавек, родапачынальнік, прабацька, «чалавек у сабе». Відавочна, у семантыцы і імя, і прозвішча героя пазіцыянуецца яго абагульненасць, нацыянальны пачатак сінтэзуецца з універсальным: Адась Доля — гэта мастацкае ўвасабленне чалавека і яго долі/лёсу ў беларускім вырыянце. Па сутнасці, імя і прозвішча героя-апавядальніка ўяўляюць сабой своеасаблівую «згорнутую» канцэптасферу твора [3, с. 20].

Першае і самае складанае выпрабаванне ў жыцці Адася — смерць і пахаванне маці: «Кожны чужы, хто ішоў паглядзець нябожчыцу, не мінаў мяне словамі:

— Бедны сіротка. Бедны сірацінка» [4, с. 14].

Аповед у рамане «Кветкі правінцыі» асвечаны вобразам маці галоўнага героя — Марыі; пад знакам яе жыццёвай драмы адбываецца фарміраванне асобы і характару Адася Долі, яго выхаванне-сталенне. Жудаснай таямніцай, што доўгі час незагойнай ранай трывожыць душу і свядомасць сына, ахутана яе смерць. Менавіта ў гэты момант яна па-сапраўднаму пачынае існаваць для Адася — «як бы наяве», як маці, а не як проста жанчына, звыклая ў сваёй заўсёднай прысутнасці, у няспынным клопаце, ласцы і пяшчоце да сына. «Раптам, — скажа з дзіцячым максімалізмам, з жорсткай бескампраміснасцю да сябе,

© Кавальчук Я. У., 2020



Рэпазіторый БарДУ